Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# ЭКСКУРСІЯ Ў ЛЕТНІ ЛЕС
(канспект экскурсіі)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

Узрост дзяцей: 4-6 гадоў;

Тып маршруту: пешы

Працягласць па часе: 40м.

Адлегласць: 100 м.

Маршрут: дзіцячы сад – лес – дзіцячы сад

Мэта: даць уяўленні аб лесе, відах лесу, прадаўжаць знаёміць з разнастайнасцю дрэў нашай мясцовасці.

Праграмныя задачы: замацаваць веды аб сезонных зменах у прыродзе, удакладніць веды аб дрэвах, выклікаць інтарэс да раслін роднага краю, удасканальваць мову. Развіваць памяць, мысленне, дробную маторыку пальцаў рук. Выхоўваць любоў і беражлівыя адносіны да прыроды.

Ход экскурсіі:

Абсталяванне: план маршруту, пакеты для збору смецця, пітная вада, вільготныя сурвэткі, аптэчка, кошык для шышак.

Папярэдняя работа: чытанне мастацкай літаратуры, гутарка пра лес, разглядванне ілюстрацый, завучванне вершаў і загадак аб прыродзе лесу і лясных звярах, назіранні на прагулцы, прагляд прэзентацый «Правілы паводзін у лесе», прагляд урыўкаў з мультфільмаў.

Ход экскурсіі:

Выхавальнік: дзеці, сёння мы адправімся ў падарожжа. А вось куды, вы даведаецеся, калі адгадаеце загадку.

Дом з усіх бакоў адкрыты,
Ён розным дахам крыты.
Заходзь у зялёную хатку,
Свет убачыш ты багаты. (Лес.)

Ну, што хочаце ў лес на экскурсію?

Дзеці: так!

Выхавальнік: адправімся на экскурсію ў летні лес і даведаемся шмат новага пра жыццё прыроды ў гэты час года. А для пачатку ўспомнім з вамі правілы паводзін у лесе.

Дзеці: ісці па сцежцы, не шумець, неірваць расліны, не ламаць галінкі, не таптаць маленькія саджанцы, не бурыць гнёзда і мурашнікі, не чапаць дзіцянят жывёл.

Выхавальнік: а як можна дабрацца да лесу? (Адказы дзяцей.)

Дзеці імітуюць перамяшчэнне на выбраным аб'екце да леса.

У лесе:

Выхавальнік: вось мы і дабраліся! Агледзьцеся, прыслухайцеся. Чуеце, як птушкі спяваюць у лесе? "Ку-ку, ку-ку", хто так спявае?

Вядома, зязюля. Гэта яна нас сустракае. Давайце ў яе спытаем:

Зязюлячка, зязюлячка,
Пракукуй ў лесе: ку, ку –
Колькі гадоў я пражыву!

Дзеці пераймаюць голас зязюлі.

А што гэта за птушка з чырвонай шапачкай, якая дзяўбе кару бярозы. Які гук выдае дзяцел, калі стукае па дрэве?

Дзеці пераймаюць са зменай тэмпу, ад павольнага да хуткага.

Давайце разам са мной раскажам верш. Дзюбай будзе указальны палец адной рукі, а карой дрэва - далонь другой.

Дзеці выконваюць рухі згодна з тэкстам.

Дзяцел дрэва дзяўбе,
Дзюбай моцна стукае.
У дубе шукае ён жучкоў,
Самых шкодных чарвячкоў.

Якія яшчэ птушкі жывуць улетку ў лесе?

Экалагічная гульня «Адгадай, якая птушка»

Мэта: Вучыць пазнаваць птушку па звычках, вонкавым выглядзе, песнях.

Ход гульні. Дзеці па звычках, апісанні знешнасці, песням адгадваюць птушак.

Выхавальнік: давайце пойдзем па вузкай сцяжынцы. Які пад нагамі мяккі мох! Ідзём па моху нячутна, каб нас ніхто не пачуў. Мы патрапілі ў паласу яловага лесу. Чуеце, як пахне ігліцай і смалой.

Выхавальнік: дзеці, якія дрэвы растуць у яловым лесе? Елка - гэта іглічнае або лісцявае дрэва? Якія яшчэ хваёвыя дрэвы вы ведаеце? (Сасна, лістоўніца.)

Колькі тут паваленых дрэў!

Фізічнае практыкаванне "Хадзьба з высокім падыманнем калена".

Ой, я аб нешта ўкалолася! Але гэта не ёлка. Што ж гэта?

Хто калючы, нібы ёлка,
Носіць на спіне іголкі?

Вядома, вожык. Пакажыце, які ён.

Пальчыкавая гімнастыка

У лесе расце вялікая ёлка,
(Дзеці паднімаюць рукі ўверх, злучаюць пальцы хаткай.)
У ёлкі колкая іголка.
(Пружыніста злучаюць пальцы падушачкамі парамі, паказваючы колкасць.)
Пад ёлкай жыве вожык,
(Скрыжоўваюць пальцы рук.)
Яго рукамі не возьмеш.
(Сціскаюць і расціскаюць скрыжаваныя пальцы.)

Выхавальнік: якія яшчэ звяры жывуць у лесе? (Адказы дзяцей.) Прапаную пагуляць у гульню «Хітрая ліса».

Рухомая гульня «Хітрая ліса»

Мэта: практыкаваць дзяцей у бегу, спрыту. Развіваць хуткасныя якасці.

Ход гульні: гульцы стаяць у коле на адлегласці аднаго кроку адзін ад аднаго. Выхавальнік просіць усіх закрыць вочы. Затым абыходзіць дзяцей за кругам і дакранаецца да аднаго дзіцяці, якое становіцца хітрай лісой. Затым

прапануе дзецям адкрыць вочы і паклікаць лісу. Дзеці расплюшчваюць вочы і пытаюцца хорам: «Хітрая ліса, дзе ты?». Пры гэтым глядзяць адзин на аднаго. Пасля трэцяга разу ліса хутка выскакае на сярэдзіну са словамі "Я тут!". Усе гуляючыя разбягаюцца, а ліса іх ловіць. Пасля таго, як ліса злавіла 2-3 дзяцей, выхавальнік просіць дзяцей зноўстаць ў кола для выбару новай лісы.

Выхавальнік: акрамя птушак і звяроў у лесе ёсць і насякомыя. Якіх насякомых вы ведаеце? (Адказы дзяцей).

Дыдактычная гульня "Добра-дрэнна"

Выхавальнік: дзеці, на зямлі насякомых шмат ці мала? Шмат розных насякомых - гэта добра ці дрэнна?(адказы дзяцей)

Выхавальнік: час нам выходзіць з яловага лесу. Наперадзе святло. Гэта значыць, пачынаецца лісцявы лес. Якія дрэвы растуць у лісцявым лесе? (Бярозы, асіны, чаромха, каліна, рабіна.) Але чаму мне здаецца, што гэта не дрэвы, а дзяўчыкі - прыгажуні ў белых сарафанах? (Адказы дзяцей.)

Мы прыйшлі ў бярозавы гай! Як жа тут светла, прыгожа! Давайце разам з бярозкамі паводзім карагод.

Выхавальнік і дзеці выконваюць карагод вакол бярозы, прыгаворваючы:

Бярозка да сябе гукала,
Дарагіх гасцей заклікала:
Гукала, клікала:
- Хадзіце, хлопцы, на луг гуляць,
Зялёныя вяночкі завіваць.
Я да вас сагнуся,
Сама ў вяночкі заплятуся.
А вы мяне праслаўляйце,
Пунсовай стужкай упрыгожвайце.
Будуць вяночкі зялёныя,
А вы ўвесь год вясёлыя!

Выхавальнік: лес багаты не толькі дрэвамі. Улетку ў лесе спее шмат розных ягад. Але акрамя ягад у лесе шмат грыбоў, асабліва ў жніўні.

Гульня з мячом «Ядомае - неядомае»

Мэта: замацаваць веды дзяцей аб ядомых і неядомых грыбах і ягадах.

Дзеці стаяць у коле. Выхавальнік у сярэдзіне кола. Кідае мяч дзіцяці і называе ягады або грыбы, а дзіця павінна сказаць ядомыя гэты грыб або ягада ці атрутныя.

Выхавальнік: а зараз давайце пагуляем яшчэ ў адну гульню, якая называецца "Знайдзі свой грыбок". Для гульні трэба падзяліцца на групы. Давайце разлічымся на першы, другі.

Рухомая гульня «Знайдзі свой грыбок»

Мэта: практыкаваць дзяцей у арыентоўцы ў прасторы. Развіваць назіральнасць, спрыт.

Ход гульні. Дзеці дзеляцца на 2 групы. У кожнай групы макет свайго грыбочка.

Выхавальнік уключае музыку, пад якую дзеці выконваюць любімае практыкаванне або рух. Тым часам выхавальнік перастаўляе грыбы. Па заканчэнні музыкі, дзеці павінны хутка знайсці свой грыб і ўстаць каля яго.

Выхавальнік: наша падарожжа падыходзіць да канца. Давайце ўсе разам развітаемся з лесам:

Да сустрэчы, лес дрымучы! Мы да цябе прыйдзем яшчэ.

Выхавальнік: спадабалася вам нашае падарожжа? Што найбольш спадабалася?

У другой палове дня прапанаваць дзецям намаляваць свае ўражанні аб экскурсіі ў летні лес.





